■ Зачапіла

Рэверс з сецiва

## В. Шкленнік. «ПЕНСІЯНЕРЫ ПАД ПРЫЦЭЛАМ ЗЛАЧЫНЦАЎ» *(«Звязда» за 30 ліпеня)*

— Што і казаць, тэма актуальная. Прыгадалася, як некалькі гадоў таму па пад'ездах у шматкватэрных дамах хадзілі нейкія людзі з клункамі. Яны расказвалі гісторыю, што, маўляў, едуць кудысьці за мяжу, але іх не прапускаюць з грузам вопраткі. Таму яны яе і распрадаюць. Самае цікавае, што якраз пенсіянеры і «вяліся» на прапановы гэтых гандляроў. Ну, а калі станавілася зразумела, што пад выглядам добрага тавару ім падсунулі няякасную танную падробку, то было ўжо позна.

Неяк да мяне прыходзіў міліцыянер. Ён цікавіўся інфармацыяй пра суседа, які не з'яўляўся па месцы жыхарства два месяцы... Але хто ж яго ведае, сапраўдны гэта ўчастковы міліцыянер ці ашуканец? Таму я выбраў за лепшае патэлефанаваць на апорны пункт і папрасіць да тэлефона гэтага міліцыянера. Але там адказалі, што ён якраз пайшоў у наш дом. Значыць, сапраўдны. Адчыняў дзверы і думаў, што пачую ў свой адрас незадаволеную рэпліку. Але міліцыянер з усмешкай вымавіў: «Перастрахоўваецеся? Правільна робіце!»

Я для сябе даўно ўсвядоміў: бясплатны сыр бывае толькі ў пастцы. Дык навошта ж дабравольна ў яе сунуць галаву?

**Іван Карнееў**, *г. Бабруйск.*

## Н. Дрындрожык. «КОЖНАЙ БЫ ВЁСЦЫ ПА ТАКОЙ НІКІЦІНАЙ» *(«Звязда» за 30 ліпеня)*

— Я асабіста не ведаю Людмілу Нікіціну, і пра Заронава чую ўпершыню. Але пасля таго, як прачытаў артыкул, вельмі захацелася выправіць гэтае ўпушчэнне. Якраз у мяне ў другой палове жніўня адпачынак. Мы з жонкай вырашылі сёлета не ехаць за мяжу, а павандраваць на машыне па Беларусі. Рыхтуемся, складаем маршрут. І ўжо ўключылі туды Заронава. Паедзем у музей не з пустымі рукамі — на гарышчы ў бацькоўскай хаце ў нас хапае рарытэтных прадметаў: калаўрот, прасы металічныя, цэлы чамадан цацак...

Я цалкам згодны з аўтарам артыкула: калі б у кожнай вёсцы было хоць бы па адной такой Нікіцінай, дык сельскі турызм у нашай краіне квітнеў бы! А так... Вёскі паступова пусцеюць. Узяць хоць бы тую, дзе я нарадзіўся: дык там цяпер з 300 жыхароў добра калі 10 засталося... А ўсё таму, што не знайшлося энтузіяста, «рухавічка». Таму заўсёды радуюся, калі чытаю ў «Звяздзе», што, напрыклад, бізнесмен вырашыў адрадзіць закінутую вёску Цінявічы ў Гродзенскай вобласці. І робіць там турыстычны комплекс...

І яшчэ... Я вельмі рады за Людмілу Канстанцінаўну. Як па мне, яна шчаслівы чалавек, бо ведае, дзеля чаго жыве, не распыляецца на пустое. Займаецца любімай справай, гуртуе вакол сябе аднадумцаў, а муж з сынам, што немалаважна, яе падтрымліваюць. Бо, думаю, не кожнаму б спадабалася, што жонка сямейны бюджэт укладае ў музей. Дай Бог здароўя і доўгіх гадоў жыцця гэтай прыгожай жанчыне!

**Уладзімір В.**, *Мінск.*

## Н. НІКАЛАЕВА. «РЭКОРДЫ ПРЫЁМНАЙ КАМПАНІІ» *(«Звязда» за 4 жніўня)*



— Скажыце, чаму ўсіх хвалююць невысокія балы на інжынерных спецыяльнасцях, а 130—140 балаў, з якімі абітурыенты паступаюць на «фізіку», «матэматыку», «інфарматыку» ў педагагічныя ВНУ ці ў Белдзяржуніверсітэт, успрымаюцца ўжо як норма? Няўжо магчыма выхаваць будучага настаўніка з такім «багажом» ведаў на старце? Значыць, зноў ВНУ будуць вымушаны ўводзіць спецыяльныя курсы, каб хоць крыху падцягнуць слаба падрыхтаваных першакурснікаў да ўніверсітэцкага ўзроўню. А потым зноў будзем здзіўляцца, чаму абітурыенты не ведаюць, якім прыборам вымяраецца сіла тока. А хто іх вучыць у школе?

На жаль, вышэйшая адукацыя стала ў нас усеагульнай. Яна даступная ўсім, у каго ёсць сродкі, каб аплачваць сваё навучанне. Пагляздзіце на прахадныя балы на платную форму навучання. Спецыяльнасць «праектаванне і вытворчасць сельскагаспадарчай тэхнікі» ў БДАТУ — усяго 84 балы! Зоймемся арыфметыкай: дапусцім, абітурыент набраў мінімальную колькасць балаў па трох тэстах (10+15+10 балаў) — гэта 35 балаў у суме. Які ж у яго сярэдні бал школьнага атэстата — 5,0? І гэта будучы канструктар? А на вельмі многіх спецыяльнасцях прахадныя балы ўвогуле адсутнічаюць — гэта значыць, што ўзялі ўсіх, хто падаў дакументы!

Абсалютна відавочна, што ЦТ прыцягвае шмат выпадковых людзей. І ўстаноўленыя мінімальныя парогі — умоўная рэч. Няўжо 5 балаў, якія трэба набраць на ЦТ будучым ваенным, пагранічнікам, праваахоўнікам ці ратавальнікам, можна назваць сур'ёзным шлагбаумам на ўваходзе? Давайце будзем шчырымі і лепш увогуле адменім мінімальны парог або... усё ж такі задумаемся над тым, ці патрэбна нам столькі людзей з дыпломамі, але без ведаў?

**Б.Г.**, *Мінская вобл.*

## Н. Зігуля. «ЁН НІКОЛІ НЕ КРЫВІЎ ДУШОЙ» *(«Звязда» за 3 жніўня)*

— Мы сёння вельмі шмат гаворым пра патрыятызм, пра вайну, пра тое, як здзекліва перапісваецца гісторыя не зацікаўленымі ў праўдзе краінамі, якія хочуць дыктаваць сваю волю іншым народам. На гэтым фоне творы Алеся Адамовіча асабліва каштоўныя сваёй праўдзівасцю і дакладнасцю. Вельмі добра, што ў Беларусі знайшлося выданне, якое мэтанакіравана, настойліва, крок за крокам ажыццяўляе такі важны праект. Дзякуй газеце за такую вялікую справу.

Кажуць, што першай ахвярай на вайне становіцца праўда. Мой бацька, франтавік, лічыў Алеся Адамовіча пісьменнікам і публіцыстам з вялікай літары. Менавіта за тое, што той казаў гэтую праўду нават тады, калі яе не хацелі чуць. Я чытала артыкул у газеце, і мне ўспаміналіся словы вядомага расійскага кінаэнацыі Армена Мядзведзева пра фільм «Ідзі і глядзі». Гэты чалавек з 1984 года ўзначальваў Галоўную сцэнарна-рэдакцыйную калегію Дзяржкіно СССР. Ён пісаў: «Тое, што мы ўбачылі падчас прагляду фільма ў Дзяржкіно, выклікала адчуванне шоку. Так аб Айчыннай вайне яшчэ ніхто не здымаў, такога народа-воіна і пакутніка мы на экране да гэтай пары не бачылі. Пасля прагляду я папрасіў прабачэння ў Алеся Адамовіча і Элема Клімава за тых, хто не верыў у карціну, хто перашкаджаў ёй».

Упэўнена, што музей усё ж такі адкрыецца. У гэтым павінны быць зацікаўлены мы ўсе да аднаго. Няўжо мы не разумеем, што гэта не проста памяць, гэта — наша сумленне? А яно або ёсць, або яго няма.

**Вераніка Сяргееўна**, *Брэсцкая вобласць.*

ZVAROT@ZVIAZDA.BY

# НУМАР «ЛЮКС» ДЛЯ БАРСІКА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

З гаспадаром заключаюць дагавор на аказанне паслуг пры часовым утрыманні ката ці сабакі. Каб засяліць жывёлу, трэба мець пры сабе ветэрынарны пашпарт і запоўніць анкету. Пытаюцца пра асаблівасці характару гадаванца, яго звычайны рацыён, шкодныя звычкі — усё, каб зрабіць пражыванне чатырохлапага камфортным.

На жаль, прыстроіць у гатэль на час адпачынку можна не кожную жывёлу. Як правіла, не прымаюцца байцоўскія пароды сабак, хворыя і аслабленыя гадаванцы. Тых, каму больш за восем гадоў, бяруць толькі пад распіску ад гаспадара, што той не будзе прад'яўляць прэтэнзій праз магчымыя наступствы па ўзросце.

## Бегавая дарожка і папка з пажаданнямі

Ці ўдаецца запоўніць гатэлі для жывёл у летні сезон? **Уладальніца гасцініцы «Чатыры лапы» Людміла ЗАХАРАНКА** кажа, што ў іх з 16 месцаў цяпер заняты 11 (у астатнія поры года звычайна толькі 6-8). Гадаванцаў прывозяць у асноўным на 10-14 дзён.

Харчаванне — у адпаведнасці з указаннямі, якія пакідаюць гаспадары. Сухі корм, вільготны, каша з мясам, малако... Плюс, паколькі гасцініца знаходзіцца на прыватным участку, жывёл частуюць прысмакамі з агарода.

— Хутка да нас прыедзе сабака, кітайскі хахлаты, — аматар груш. Якраз грушавы сезон пачынаецца, — дзеліцца Людміла. — Нехта агуркі любіць. Каты звычайна пырнік ядуць. Для мяне гэта пустазелле, а для іх — найлепшы прысмак.

З дадатковых паслуг карыстаюцца попытам заняткі на бегавой дарожцы: некаторым пародам сабак недастаткова кароткіх прагулак.

Гасцініца, дарэчы, гатова прымаць розных жывёл. Адавалі, напрыклад, пацукоў, папугая, рыбак. «На другі год хочуць прывезці труса. Лічыць паклы, ці атрымаецца на грашах. Але ў асноўным на часовым утрыманні знаходзяцца каты і сабакі. Догляд іншых гадаванцаў, тых жа рыбак, працей даручыць суседзям», — мяркуе Людміла.

У іншай гасцініцы — «ZOOHOTEL» — цяпер жывуць адзінаццаць сабак і тры кошкі. Ёсць яшчэ месцы для шасці жывёл. Сабакі прыязджаюць розных памераў: ад маленькіх ёркаў і балонак да вялікіх сенбернараў і ірландскіх ваўкадаваў. Буйныя пароды засяляюць у вулічныя вальеры з будкамі, сабак, якія прывыклі да кватэрнага ўтрымання, — у спецыяльны домік. Дэкаратыўныя пароды разам з кошкамі жывуць у доме, у сям'і.

> **Першая дзяржаўная гасцініца для жывёл адкрылася толькі тры тыдні таму. Гэта самы вялікі гатэль — у ім каля 70 нумароў. Заняты пакуль толькі чатыры.**

Па словах **гаспадыні гатэля Алесі ПАЛУЯН**, асаблівыя пажаданні па ўтрыманні жывёл бываюць не часта:

— Як правіла, стандартны догляд падыходзіць усім. Часам гаспадары ўсё ж такі пішуць памяткі пра тое, як іх гадаванца расчэсваць, як гуляць, мыць лапы, якія вітаміны даваць. Такія памяткі я захоўваю ў асобнай папцы. Практычна ўсе пажаданні мы можам выканаць.



Хто з жывёл перажывае разлуку больш? Алеся кажа, што сумуюць усе: сабакі па гаспадару, кошкі — па доме. А вось шчанюкі і кацяняты практычна не сумуюць, іх лягчэй адцягнуць гульнёй ці прысмакамі. На другі-трэці дзень гадаванцы звычайна адаптуюцца.

— Каб мінімізаваць стрэс, прапануем прыехаць да нас загадзя і пазнаёміцца з новымі людзьмі і абстаноўкай. Тады другім разам жывёлы пазнаюць гэта месца і не будуць моцна перажываць.

> **«У асноўным на часовым утрыманні знаходзяцца каты і сабакі. Догляд іншых гадаванцаў, тых жа рыбак, працей даручыць суседзям».**

Першая дзяржаўная гасцініца для жывёл адкрылася толькі тры тыдні таму. Гэта самы вялікі гатэль — у ім каля 70 нумароў. Заняты пакуль толькі чатыры.

— Няшмат, — згаджаецца **Тамара ЦАРЫКОЎСКАЯ, дырэктар прадпрыемства «Фаўна горада»**, на базе якога знаходзіцца гатэль. — Але попыт ёсць: частка месцаў распісана да канца жніўня.

Пастаяльцамі пакуль былі толькі сабакі. Прыязджалі звычайна на 2-3 дні.

У гасцініцы ёсць чатыры нумары «люкс», кожны па 12 квадратных метраў (для параўнання: плошча звычайнага пакоя для ката — паўтара «квадрата», для сабакі — чатыры). Адзін з іх цяпер якраз заняты.

Тамара Царыкоўская расказвае, што перад тым як адкрыць гатэль, яны праводзілі апытанне. Са снежня размяшчалі аб'явы на жыроўках, цікавіліся, ці здалі б людзі сюды свайго гадаванца, колькі гатовы былі б заплаціць за пражыванне. З улікам гэтай інфармацыі і планавалі сваю дзейнасць. Расцэнкі ў дзяржаўнай гасцініцы, дарэчы, крыху ніжэйшыя за сярэднія па горадзе. Нумар для ката, без выдаткаў на харчаванне, каштуе 12,7 рубля ў суткі, для сабакі — ад 14 да 18 рублёў у залежнасці ад памеру жывёлы. «Люксавы» пакой, зразумела, даражэйшы — 24,6 рубля.

## Пад прыглядам прафесіяналаў

Пра сэрвіс і зручнасць гасцініц мы распыталі мінчан, якія карысталіся іх паслугамі.

Кацярына, гаспадыня англійскага бульдога, пакідае свайго любімца ў гатэлі адзін-два разы на год. Прызнаецца: гэтай пародзе патрэбен асаблівы догляд, таму даручыць сабаку суседзям ці сваякам не можа.

— Англійскія бульдогі ў спякоту могуць пачаць задыхацца. Яны гуляюць, скачуць і не адчуваюць, што варта спыніцца, — тлумачыць Кацярына. — Пачынаецца прыступ, які трэба своечасова заўважыць і прыняць адразу меры па выратаванні. Тыя, хто трымаў такую пароду, ведае, што рабіць. Плюс улетку бульдогу трэба працірацць складкі. У гасцініцы нясуць адказнасць за жывёлу, таму дакладна выконваюць усе нашы пажаданні. У адрозненне ад сваякоў, якія могуць рабіць гэта не так добрасумленна. Дый у знаёмых няма магчымасці ўзяць нашу Тэйку да сябе.

На думку Кацярыны, гатэль павінен быць прасторным. І абавязкова побач з жывёламі мусіць знаходзіцца хтосьці з людзей, каб гадаванцы не сядзелі ў адзіноце.

Гаспадыня сабакі Марына часта бывае ў камандзіроўках. Для свайго Тоці на час ад'езду яна стараецца стварыць максімальна камфортныя ўмовы.

— Нам вельмі важна, каб пры любых непрадбачаных абставінах жывёле аказалі высокакваліфікаваную дапамогу і звязаліся з намі. Таксама хочам, каб Тоці ў нашу адсутнасць весела праводзіў час, а ва ўмовах гасцініцы ў яго гэта добра атрымліваецца. За некалькі гадоў ён ужо паспеў знайсці сяброў, з якімі можна ўдосталь набегацца на свежым паветры, таму знаходжанне ў гатэлі ён успрымае як канікулы ў дзіцячым лагеры.

> **«У гасцініцы нясуць адказнасць за жывёлу, таму дакладна выконваюць усе нашы пажаданні. У адрозненне ад сваякоў, якія могуць рабіць гэта не так добрасумленна».**

Ларыса трымае двух катоў. Паслугамі гатэля для жывёл карыстаецца ўжо гадоў пяць. Вось і цяпер яе сфінксы адпачываюць у нумары, пакуль жанчына гасціе за гарадам у сястры.

Пра тое, каб пакідаць катоў на час водпуску знаёмым, Ларыса нават не думала: «Я да гэтага стаўлюся нашмат больш сур'ёзна. Лічу, што кожнай справай павінен займацца прафесіянал».

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*